# У адпаведнасці з праўдай гісторыі

## Роля В.З. Харужай у дзейнасці Віцебскага падполля

**Жыццю і дзейнасці Веры Захараўны Харужай прысвечана нямала публікацый. Тым не менш подзвіг В.З. Харужай у акупаваным Віцебску застаецца недастаткова вядомым аспектам яе біяграфіі. У гістарыяграфіі замацавалася меркаванне, што Вера Харужая была арганізатарам і кіраўніком адной з віцебскіх падпольных груп. Гэта знайшло адлюстраванне і ў сучаснай вучэбнай літаратуры. Але сёння ёсць падставы сцвярджаць, што роля В.З. Харужай у Віцебскім падполлі была больш значнай – яна стала стваральніцай не проста падпольнай групы, а кіруючага падпольнага партыйнага цэнтра.**



Ніна ДАРАФЕЕНКА,
кандыдат
гістарычных навук



Анатоль ДУЛАЎ,
кандыдат
гістарычных навук

Пацвердзіць высновы даследчыкаў дапаможа схема, створаная Васілём Раманавічам Кудзінавым, які ўвосень 1942 года быў адказным арганізатарам абкама КП(б)Б па горадзе Віцебску, затым – першым сакратаром гаркама партыі, і перададзеная ім асабіста Н.І. Дарафеенка ў 1960-я гады падчас сумеснай працы ў камісіі абкама КПБ па вывучэнні і прызнанні Віцебскага падполля. Схема была складзена ў гады Вялікай Айчыннай вайны ці ў хуткім часе пасля завяршэння. У цэнтры яе ў вялікім прамавугольніку знаходзіцца надпіс «Вера», злева ад надпісу – два звязаныя з ім прамавугольнікі («Суранова Дуся» і «Панкова Софья Сергеев.»), справа – колькасныя даныя аб тых людзях, з кім Вера Харужая павінна была сустрэцца ў Віцебску (сярод 118 адрасоў, якія атрымала Вера, былі адрасы 14 камуністаў, 10 камсамольцаў, супрацоўнікаў чыгункі, сталовай, аэрадрома і нават камендатуры). Асноўны змест гэтага дакумента адлюстроўвае сувязі Веры Харужай у Віцебскім падполлі (гл. схему).

Перш чым перайсці да аналізу схемы, неабходна акрэсліць гістарычны кантэкст. Паколькі спроба стварэння ў Віцебску кіруючага партыйнага цэнтра ў ліпені 1941 года аказалася няўдалай *[1, с. 80–82; 2, с. 471]*, падполле ў горадзе ўзнікала ў значнай ступені стыхійна. Некалькі груп стварылі пакінутыя ў горадзе радавыя камуністы (непасрэдна для гэтай дзейнасці было пакінута 60 чалавек) і камсамольцы, некалькі – беспартыйныя патрыёты, якія аб’ядноўваліся на падставе сумеснай даваеннай працы ці сямейных, сваяцкіх сувязей. Утварыліся групы К.С. Акаловіч, М.Л. Мурашкі – Р.Ф. Махнова, А.Я. Белахвосцікава, В.А. Вярбіцкага, У.А. Казлоўскага і інш. Ужо ў канцы 1941 года ў Віцебску дзейнічала да 20 падпольных груп і нямала патрыётаў-адзіночак.

Пасля бітвы пад Масквой і контрнаступлення Чырвонай арміі Віцебск стаў прыфрантавым горадам, быў насычаны варожымі войскамі, разведвальнымі і контрразведвальнымі органамі. Тут размясцілася мноства штабоў, рамонтных майстэрняў, складоў, шпіталяў. Сюды адводзіліся на перафарміраванне разбітыя франтавыя часці вермахта. Горад уяўляў сабой буйны транспартны вузел, праз яго праходзілі камунікацыі, што забяспечвалі германскія войскі рэзервамі, боепрыпасамі, харчаваннем. У Віцебску быў размешчаны ваенны аэрадром. Такім чынам, горад меў важнае ваенна-стратэгічнае значэнне для абодвух ваюючых бакоў.

Кіраўніцтва Віцебскім падполлем ажыццяўлялася партыйнымі і камсамольскімі органамі з партызанскіх баз. У верасні 1942 года абкам КП(б)Б зацвердзіў

В.Р. Кудзінава сваім адказным арганізатарам па горадзе Віцебску. Да канца 1942 года ў Віцебску дзейнічала ўжо 56 падпольных груп. Многія з іх устанавілі сувязі з армейскімі і аператыўна-чэкісцкімі групамі, партызанскімі фарміраваннямі, з В.Р. Кудзінавым, камсамольскімі работнікамі, сталі выконваць іх заданні. З аднаго боку, гэта спрыяла актывізацыі барацьбы, падпольшчыкі адчувалі падтрымку, расла іх упэўненасць у сваіх сілах. З другога ж, перапляценне мноства сувязяў у шэрагу выпадкаў аслабляла канспірацыю, прыводзіла да непаразуменняў. Разведінфармацыя, што паступала з Віцебска па розных каналах, была фрагментарнай і не давала магчымасці скласці поўнае ўяўленне пра становішча ў горадзе. Апрача таго, на працягу 1942 года рабіліся намаганні па цэнтралізацыі кіравання партызанскай і падпольнай барацьбой: у сакавіку была створана Паўночна-Заходняя аператыўная група ЦК КП(б)Б, у маі – Цэнтральны штаб партызанскага руху, у верасні – Беларускі штаб партызанскага руху.

Існавала аб'ектыўная неабходнасць стварэння адзінага кіруючага цэнтра непасрэдна ў Віцебску. Гэтая задача была ўскладзена ЦК КП(б)Б на Веру Захараўну Харужую, якая мела вопыт падпольнай барацьбы ў Заходняй Беларусі. У спісах партработнікаў, накіраваных у тыл ворага, В.З. Харужая – інструктар Пінскага райкама КП(б)Б, значылася пад уліковым нумарам 27. Насупраць яе прозвішча пазначана: «Включить в состав подпольного партийного центра в Витебске». Аднак паколькі названага цэнтра не існавала, Вера Захараўна фактычна павінна была яго стварыць. В.З. Харужую і яе паўнамоцтвы сакратар ЦК КП(б)Б, першы намеснік кіраўніка Беларускага штаба партызанскага руху Р.Б. Эйдзінаў пазней ахарактарызаваў наступным чынам: «Хоружая – революционерка высшего класса, и направлялась в Витебск как эмиссар ЦК партии Белоруссии с очень широкими полномочиями... Это выше, чем секретарь горкома партии» *[3]*.

24 жніўня 1942 года Вера Захараўна разам з групай, у якой было 17 жанчын, выехала з Масквы і прыбыла ў прыфрантавую паласу да Віцебскіх (Суражскіх) «варот», дзе размяшчаліся штаб-кватэра Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б (першы сакратар Іван Андрэевіч Стулаў) і абласная аператыўна-чэкісцкая група (кіраўнік – Сямён Васільевіч Юрын – «Васільеў»). У навакольных вёсках працягвалася ўзмоцненая падрыхтоўка ўдзельніц групы В.З. Харужай для работы ў Віцебску. Падкрэслім, што назва «група Харужай» адносіцца менавіта да групы, з якой Вера прыбыла з Масквы. Паколькі высветлілася, што дакументы ўдзельніц групы, падрыхтаваныя ў Маскве, не вытрымаюць праверкі, а «легенда», з якой жанчыны мусілі з'явіцца і легалізавацца ў Віцебску (яны павінны былі выдаваць сябе за супрацоўніц швейнай майстэрні, што вяртаюцца ў родны горад), вельмі непраўдападобная, было вырашана не спяшацца з яе адпраўкай у поўным складзе ў тыл ворага.



Вера Захараўна Харужая



Васіль Раманавіч Кудзінаў. Пасляваенны здымак.

20 верасня 1942 года праз Віцебскія «вароты» Вера Харужая, Антаніна Ермаковіч і Еўдакія Суранава ў суправаджэнні В.Р. Кудзінава перайшлі ў размяшчэнне атрада М.Ф. Біруліна 1-й Беларускай партызанскай брыгады. 27 верасня партызанская сувязная Клаўдзія Балдачова («Бяроза») прывяла ў Віцебск Дусю Суранаву

## ПРА АЎТАРАЎ

**ДАРАФЕЕНКА (МАІСЕЕВА) Ніна Іванаўна.**

Нарадзілася ў 1923 годзе ў в. Уласава Віцебскай вобласці. У 1941 годзе скончыла педагагічныя курсы ў Віцебску, у 1949 годзе – гістарычны факультэт Молатаўскага (Пермскага) дзяржаўнага педагагічнага інстытута, у 1956 годзе – Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС.
У 1944–1952 гадах працавала ў школах Суражскага раёна, другім сакратаром райкама камсамола, інспектарам Віцебскага аблана, інструктарам Віцебскага абкама партыі. З 1952 па 1962 год працавала ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце, з 1962 па 1980 год выкладала ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя С.М. Кірава.
Кандыдат гістарычных навук (1968), дацэнт (1971).
Удзельніца патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
Адна з аўтараў кніг «Витебское подполье» і «Юные герои Витебщины».
Аўтар энцыклапедычных артыкулаў, шматлікіх публікацый у навуковым і перыядычным друку.
Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Віцебскага падполля.

**ДУЛАЎ Анатоль Мікалаевіч.**

Нарадзіўся ў 1978 годзе ў Віцебску. У 2000 годзе скончыў факультэт беларускай філалогіі і гісторыі, у 2003 годзе – аспірантуру Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. З 2000 года – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава.
Кандыдат гістарычных навук (2006), дацэнт (2010).
Аўтар больш як 50 навуковых і вучэбна-метадычных работ. Адзін з аўтараў кнігі «Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы».
Сфера навуковых інтарэсаў: сацыяльная гісторыя і гісторыя жаночага руху ў БССР 1920–1930-х гг., гісторыя Віцебшчыны.

(па дакументах – Марыя Пятроўская) і Тоню Ермаковіч, і яны адразу пачалі дзейнічаць, наладзілі сувязі з некаторымі мясцовымі патрыётамі. 1 кастрычніка ў суправаджэнні Тоні Ермаковіч, якая стала сувязной, у Віцебск прыбыла і В.З. Харужая (па дакументах – Ганна Карнілава).

Выходзячы з інфармацыі, зафіксаванай на схеме В.Р. Кудзінава, можна сцвярджаць, што кіруючы падпольны партыйны цэнтр узначаліла В.З. Харужая, а ўвайшлі ў яго Е.С. Суранава і С.С. Панкова. Выкажам гіпотэзу, што склад цэнтра аформіўся яшчэ ў час знаходжання групы Харужай у прыфрантавой паласе. Пасля таго як В.З. Харужая і Е.С. Суранава накіраваліся ў тыл ворага, групу, што засталася ў прыфрантавой паласе, узначаліла Соф'я Панкова. Яна павінна была пазней далучыцца да паплечніц у акупаваным Віцебску.

У Віцебску Дуся Суранава, а потым і Вера Харужая знайшлі прытулак у сям'і сваякоў Дусі Вараб'ёвых на вуліцы Трактарная, 4. На схеме абазначаны Васіль Вараб'ёў, рабочы хлебазавода, яго жонка (Агаф'я. – **Аўт.**) і Марыя Вараб'ёва («бабуля Маша», гаспадыня дома, якую Вера Захараўна згадвала ў сваіх лістах з асаблівай цеплынёй).

У найскладаных умовах, без надзейных дакументаў і матэрыяльных сродкаў Вера Захараўна ўдваіх з Дусяй Суранавай рабіла тое, што павінна была рабіць вялікая падрыхтаваная група: рызыкуючы жыццём правярала тыя 118 адрасоў, якія атрымала ад Кудзінава і сабрала сама сярод партызан. У спісе аказалася «много пустых мест», былі небяспечныя сустрэчы. Аднак удалося наладзіць кантакт з многімі сапраўднымі патрыётамі, падабраць каштоўных памочнікаў. Невыпадкова ў лістах Веры Захараўны часта сустракаюцца фразы: «Хороших людей много», «Это чудесные люди» і інш.




**Схема сувязяў В.З. Харужай у Віцебскім падполлі, складзеная В.Р. Кудзінавым.**
*Асабісты архіў Н.І. Дарафеенка*



Пэўныя сувязі з віцебскімі падпольшчыкамі былі наладжаны паплечніцамі Веры Харужай яшчэ да з'яўлення яе ў Віцебску. Так, праз сувязную «Бярозу» (Клаўдзію Балдачову) была ўсталявана сувязь з падпольнай групай Андрэя Ліпці, у склад якой уваходзілі мясцовыя жыхары кітайскай нацыянальнасці (Васіль Чучалін, Сяргей Сюдаболь, сувязныя сёстры Чжан Ванфу). К. Балдачова была замужам за кітайцам, сваяком Ліпці, таму яна добра ведала ўсіх членаў групы. Група А. Ліпці дзейнічала ў адзінай на той час у горадзе пральні на вуліцы Леніна. Ад гэтай групы В.З. Харужай паступалі каштоўныя даныя. З вокнаў пральні падпольшчыкі назіралі за рухам транспарту па цэнтральнай вуліцы горада, па колькасці і маркіроўцы бялізны, якую здавалі немцы для мыцця,

яны атрымлівалі звесткі пра вайсковыя падраздзяленні праціўніка.

Таксама праз «Бярозу» на схеме пазначана сувязь з «членом партии», імя якога, на жаль, не названа. Адзінай падыходзячай кандыдатурай, з вядомых нам, з'яўляецца камуністка Марыя Іванаўна Гульбе, мясцовая жыхарка, латышка, якая добра ведала нямецкую мову і мела надзейныя дакументы. М.І. Гульбе хадзіла па горадзе, заходзіла ў розныя ўстановы, да знаёмых, асабліва тых, хто працаваў у акупацыйным апараце, і збірала такім чынам немалаважныя звесткі.

Знаёмства Веры Харужай з Гульбе адбылося ў сям'і інструктара падпольнага абкама па горадзе Віцебску Марыі Ільінічны Мацэнка. Сям'ю Мацэнка (маці і брата), а таксама яе сваячак, сясцёр Ефрасінню і Аляксандру Волат, якія да гэтага выконвалі заданні армейскага разведчыка П.С. Татарынава, наведала Дуся Суранава як толькі з'явілася ў Віцебску. На схеме пазначана, што сям'я М.І. Мацэнка і сёстры Волат непасрэдна звязаны з Верай Харужай. Менавіта ў падвале дома па 2-й Ветранай (цяпер Грыбаедава, 14), дзе месціліся маці і брат Марыі Ільінічны, Гульбе і Вера доўга гутарылі вечарамі. М.І. Гульбе памерла ў 1943 годзе. Брат М.І. Мацэнка інфармаваў Веру пра становішча на чыгунцы, дзе ён працаваў.

Разведчыц вельмі цікавіў віцебскі аэрадром. Вера Захараўна наладзіла сувязь з падпольшчыцай групы К.С. Акаловіч Матронай Кліменцьеўнай Оскер, брат якой быў камісарам аднаго з партызанскіх атрадаў, а пляменніца – армейскай разведчыцай. М.К. Оскер, сціплая краўчыха-інвалід, не выклікала падазрэнняў у акупантаў. Яе непрыкметны домік непадалёк ад аэрадрома (5-я Вінчэўскага, 16, або 2-я Нагіна, 18) стаў явачнай кватэрай, дзе Вера сустракалася з многімі людзьмі. Менавіта тут, паводле схемы, у «темной комнате», адбылася сустрэча з «нявестай партызана Германовіча» (на схеме памылкова «Гапановіча»). Гэта была камсамолка Зінаіда Аляксандраўна Шаракова (Матвіевіч), якая працавала на аэрадроме. Пасля сустрэчы з «цёцяй Аняй» (так адрэкамендавалася Харужая), Зіна на працягу месяца кожны вечар пасля работы інфармавала М.К. Оскер пра тое, што адбываецца на аэрадроме. Далей гэтыя каштоўныя звесткі перадаваліся Веры Харужай і яна паведамляла іх шыфроўкамі праз В.Р. Кудзінава ў ЦК КП(б)Б і вайсковаму камандаванню. У 1943 годзе ў час масавых правалаў у выніку пранікнення ў падполле правакатараў М.К. Оскер загінула.



Зінаіда Аляксандраўна Шаракова (Матвіевіч). Пасляваенны здымак.



Соф'я Панкова з сынам Аляксеем, 1941 год



Ірына Чжан Ванфу. Пасляваенны здымак.

В.З. Харужай удалося наладзіць прамыя сувязі як з асобнымі падпольшчыкамі, сем'ямі патрыётаў, так і з падпольнымі групамі. У кастрычніку 1942 года Вера Захараўна паведамляла, што ў іх на сувязі ёсць ужо «первые 20 человек». Кудзінаў абазначыў іх на схеме як адну групу. Таксама Вера Захараўна была звязана з групай «Радзіма», якая дзейнічала на чыгунцы і налічвала да 30 чалавек.

Быў у Харужай пароль да Ганны Андрэеўны Бекішавай – сястры кіраўніка падпольнай групы Івана Бекішава. Аднак гэтая сувязь, якая магла быць карыснай, па нейкіх прычынах не атрымала належнага развіцця.

Вялікае значэнне для Веры мела знаёмства з армейскай разведчыцай Вольгай Пінчук. Сувязной для Пінчук была Ірына Чжан Ванфу. Двойчы праз яе Пінчук перадавала шыфроўкі Веры.

На схеме абазначана таксама Ганна Пятроўна Іванькова. Яна ўваходзіла ў склад групы, з якой В.З. Харужая прыбыла з Масквы. У Віцебску Іванькова з'явілася, каб высветліць, чаму Вера не выходзіць на сувязь, калі тая ўжо была арыштавана. Усяго ж у акупаваным горадзе пабывалі толькі 5 жанчын з групы, уключаючы саму Веру Захараўну.

На жаль, не ўсе сувязі В.З. Харужай у Віцебскім падполлі ўдалося расшыфраваць. Невядома, напрыклад, хто такія «родственники Озолова Михаила», якія згаданы на схеме і ў лістах Веры Захараўны, што за чалавек ваеннапалонны: яго, паводле звестак В.Р. Кудзінава, «Вера направила в партизаны, но он не дошел, вернулся в Витебск, якобы «свихнул ногу в пути» (гл. схему).

Такім чынам, В.З. Харужая была накіравана ў Віцебск, каб увайсці ў склад падпольнага партыйнага цэнтра, але ёй давялося заняцца яго стварэннем. За вельмі абмежаваны тэрмін (паўтара месяца), без надзейных дакументаў, без грошай ва

ўмовах прыфрантавога горада вопытная падпольшчыца паспела шмат зрабіць дзякуючы падтрымцы мясцовых патрыётаў. Яна наладзіла сувязі з многімі падпольнымі групамі, што дзейнічалі ў горадзе, з падпольшчыкамі-адзіночкамі, прыцягнула да работы новых людзей, аб чым перακанаўча сведчыць схема В.Р. Кудзінава. Можна сцвярджаць, што Вера стварыла партыйны кіруючы цэнтр, які дзейнічаў у Віцебску з 27 верасня да 13 лістапада 1942 года. Відавочна, да першапачатковага ядра цэнтра ў Віцебску (В.З. Харужая і Е.С. Суранава) далучыліся людзі, з якімі



Н.І. Дарафеенка праводзіць экскурсію па экспазіцыі «Памяці патрыётаў Віцебшчыны» Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. У цэнтры – сын В.З. Харужай С.С. Харужы

Вера Захараўна раілася па важнейшых пытаннях – М.І. Гульбе і В.С. Вараб'ёў. У цэнтр паступала інфармацыя амаль з усіх куткоў горада, у тым ліку з такіх стратэгічна важных аб'ектаў, як аэрадром і чыгунка. У дачыненні да патрыётаў, якіх здолела згуртаваць вакол сябе Вера Захараўна, мэтазгодна ўжыць паняцце «віцебская група Харужай».

Эфектыўнасць работы В.З. Харужай высока ацаніў Р.Б. Эйдзінаў: «Для действий фронтовой авиации, – сказал он, – она (г.зн. Вера. – **Аўт.**) дала больше, чем дано за многое время до нее. Ее информация поступала сразу же в штаб армии, штаб фронта, в ЦК партии Белоруссии» *[3]*. Плённай дзейнасці В.З. Харужай спрыяў шэраг фактараў. Сярод іх, безумоўна, патрыятызм і моцныя антыфашысцкія настроі жыхароў горада, папярэдняя дзейнасць падпольшчыкаў, багаты вопыт, атрыманы Верай Захараўнай у заходнебеларускім падполлі, яе бязмерная любоў да Радзімы і адданасць партыі.

На жаль, дзейнасць цэнтра спынілася 13 лістапада 1942 года. У гэты дзень сувязная Клаўдзія Балдачова («Бяроза») прывяла ў дапамогу Харужай Соф'ю Панкову. Яны былі арыштаваны на кватэры Вараб'ёвых разам з Верай Харужай, Дусяй Суранавай, Васілём Вараб'ёвым, Марыяй Вараб'ёвай («бабуля Маша»), дзвюма яе нявесткамі Агаф'яй Вараб'ёвай і Ганнай Васільевай. 18 лістапада ўсе арыштаваныя былі перададзены з гарадской турмы ў засценкі СД на Успенскай горцы (цяпер там знаходзіцца экспазіцыя «Памяці патрыётаў Віцебшчыны» Віцебскага абласнога краязнаўчага музея). Пасля першага допыту Харужую і Панкову ізалявалі ад астатніх. Нягледзячы на страшэнныя пакуты, бесперапынныя допыты і катаванні, іншых таварышаў па падполлі арыштаваныя не выдалі. Толькі Ганна Васільева не вытрымала і назвала сапраўднае імя Харужай. 4 снежня 1942 года Вера Харужая, Еўдакія Суранава, Соф'я Панкова, Клаўдзія Балдачова і трое Вараб'ёвых былі расстраляны ў лагеры для ваеннапалонных на тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка.

17 мая 1960 года В.З. Харужай пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Відавочна, што ўклад Веры Захараўны і яе бліжэйшых паплечнікаў у барацьбу з ворагам значна большы, чым прынята лічыць. Наспеў час адлюстраваць у вучэбнай літаратуры і абагульняючых працах па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ролю В.З. Харужай у дзейнасці Віцебскага падполля, даць належную ацэнку яе подзвігу ў адпаведнасці з праўдай гісторыі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Дарафеенка, Н.І. Аб кіруючым падпольным цэнтры ў Віцебску (1941–1943). Новы погляд на абставіны падпольнай дзейнасці В.З. Харужай / Н.І. Дарафеенка // Война известная и неизвестная: материалы науч.-практ. конф., посвящ. 50-летию освобождения Витебщины от немецко-фашистских захватчиков, Витебск, 15–16 июня 1994 г. Витебский областной краеведческий музей. – Витебск, 1995. – С. 80–88.
2. Дарафеенка, Н.І. Подзвіг Веры Харужай у Віцебску / Н.І. Дарафеенка // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1 / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 471–478.
3. Гутарка М.У. Дарафеенкі з Р.Б. Эйдзінавым: стэнаграфічны запіс // Асабісты архіў Н.І. Дарафеенка.